# Патрэбны бібліятэкары. І кропка

## Ва універсітэце культуры і мастацтваў прыпынены набор на спецыялізацыю "Этнафоназнаўства", а месцы аддадзены на падрыхтоўку бібліятэкараў



*У рэдакцыю нашай газеты звярнуліся* **маці выпускнікоў вілейскай гімназіі №2 Н.Л.Завацкая і І.Р.Цеўшчакова.** *"Нашы дзеці з першага па 11 клас займаліся па спецыяльных вучэбных праграмах этнашколы. Яны вывучалі фальклорныя спевы і танец, мастацтва вуснага слова і тэатр. народныя рамёствы (выцінанка, вышыўка, саломапляценне, вязанне, аплікацыя і іншыя), вучыліся іграць на народных музычных інструментах. У складзе фальклорных калектываў гімназіі дзеці шматразова ўдзельнічалі ў мясцовых, абласных і рэспубліканскіх фальклорных конкурсах і фестывалях, маюць дыпломы. Апошнія ўзнагароды — за ўдзел у рэспубліканскім фестывалі фальклору "Берагіня", які праходзіў летам 2008 года ў гарадскім пасёлку Акцябрскі Гомельскай вобласці.*

*Вывучаючы народную спадчыну, вучні засвойвалі маральна-этычныя нормы паводзін і ўзаемаадносін, святы, абрады і традыцыі нашага народа. Мы ўдзячны настаўнікам-фалькларыстам, якія дапамагалі нам выхоўваць дзяцей у нацыянальных традыцыях і духоўнай чысціні.*

*Вілейская гімназія №2 падтрымлівае цесныя сувязі з факультэтам традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў, і нашы дзеці рыхтуюцца да паступлення на спецыялізацыю "Этнафоназнаўства". Але нядаўна мы даведаліся, што на названую спецыялізацыю ў гэтым годзе універсітэт не плануе набору. Чаму? Няўжо нашай дзяржаве не патрэбны спецыялісты з глыбокім веданнем нацыянальнай культуры і, больш таго, якія самі з'яўляюцца носьбітамі народных традыцый? Мы ўпэўнены, што этнаграфія і фальклор могуць быць дзейснымі сродкамі выхавання сучасных дзяцей, падлеткаў і моладзі, што неаднаразова падкрэсліваў і Прэзідэнт нашай дзяржавы. Таму мы лічым неабходным рыхтаваць спецыялістаў у гэтай галіне.*

*Просім вас разабрацца і дапамагчы нам вырашыць гэтую праблему".*

Каб высветліць, чаму сёлета вырашана спыніць набор на "Этнафоназнаўства", у першую чаргу мы звярнуліся на факультэт традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва БДУ культуры і мастацтваў. Аказваецца, дэкан Вячаслаў Калацэй і сам хацеў бы ведаць адказ на гэтае пытанне. Кіраўніка факультэта, а таксама педагагаў, якія выкладаюць дысцыпліны спецыялізацыі, проста паставілі перад фактам.

— Зараз мы апынуліся ў вельмі няёмкім становішчы перад школьнікамі, з якімі супрацоўнічае факультэт, — гаворыць выкладчык-этнафоназнаўца Таццяна Пладунова. — Вучні тэлефануюць, каб запісацца на падрыхтоўчыя курсы, а мы вымушаны адказваць, што набору на спецыялізацыю не будзе.

Колькі слоў трэба сказаць аб самой спецыялізацыі "Этнафоназнаўства". Роднасныя напрамкі даўно адкрыты ў суседніх краінах пад назвамі "Этнамузыказнаўства" ці "Фалькларыстыка". У Расіі, напрыклад, спецыялізацыя выкладаецца ва ўсіх ВНУ мастацкага профілю і нават ідзе размова аб увядзенні яе ў музычных вучылішчах. На Беларусі "Этнафоназнаўства" адкрыта пасля падпісання краінай Міжнароднай канвенцыі аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны і ёсць толькі ў БДУ культуры і мастацтваў. Сёлета тут адбудзецца першы выпуск этнафоназнаўцаў — усяго 5 чалавек. Гэта будуць спецыялісты "па захаванні часткі спадчыны нашага народа — аўтэнтычных фальклорных спеваў, карэннай інструментальнай этнафоніі, рэгіянальнай святочна-рэкрэацыйнай дзейнасці". Менавіта так стваральнікі спецыялізацыі вызначылі прызначэнне выпускнікоў.

Патэнцыяльнымі абітурыентамі "Этнафоназнаўства" на працягу 5 гадоў былі вучні этнашкол, якія з 1 па 10 клас праз абрады, святы, спевы і танцы спасцігалі традыцыйную нацыянальную культуру. Па словах Таццяны Пладуновай, вучні такіх этнашкол, многія з якіх з'яўляюцца ўдзельнікамі мясцовых дзіцячых фальклорных гуртоў, маглі ведаць нават больш, чым універсітэцкі выкладчык — напрыклад, каля 50 танцаў сваёй мясцовасці. Зараз этнашколы актыўна дзейнічаюць як факультатывы.

— У межах "Этнафоназнаўства" вывучаюцца менавіта старажытныя пласты фальклору. У фільмах даследчыкаў іх занатавана даволі шмат. А вучні этнашкол, а таксама нашы студэнты, аб'яднаныя ў фальклорныя гурты, транслююць фальклор у побыце, — паясняе выкладчыца. — Калі гэтага не рабіць, нематэрыяльная традыцыйная культура будзе ўсяго толькі памяццю, але не практыкай. А фальклорных гуртоў, дарэчы, на факультэце некалькі: "Раме", "Кроса", "Этнасуполка", "Талака". Усе спрадвечныя беларускія святы — Масленіцу, Купалле, Юр'е, Каляды, Вялікдзень і іншыя — мы "прапяваем" у натуральным асяроддзі, і праз іх звычайныя людзі вывучаюць песню свайго роднага краю.

Гурты этнафоназнаўцаў паказваюць самабытнасць беларускай культуры на разнастайных міжнародных фестывалях і заўжды адзначаюцца дыпломамі нацыянальнага фестывалю "Берагіня". У 2008 годзе спецыялізацыя "Этнафоназнаўства" атрымала дыплом беларускай камісіі па справах ЮНЕСКА за ўклад у захаванне нематэрыяльнай культурнай спадчыны.

Як запэўніла новы адказны сакратар прыёмнай камісіі БДУ культуры і мастацтваў Ларыса Голікава, ёй невядома, па якой прычыне на спецыялізацыю "Этнафоназнаўства" спыняецца набор: сваю пасаду яна заняла ў студзені 2009 года, ужо пасля прыняцця рашэння. Першы прарэктар універсітэта Юрый Бондар патлумачыў: час ад часу ў ВНУ такое здараецца — адны спецыялізацыі часова закрываюцца, іншыя ўзнаўляюцца пасля некаторага перапынку. Усё залежыць ад патрэбы ў кадрах той ці іншай галіны. Звычайна месцы аддаюцца на карысць больш запатрабаваных напрамкаў падрыхтоўкі. Зараз, напрыклад, у краіне назіраецца катастрафічны недахоп бібліятэкараў, толькі палова бібліятэк укамплектавана кадрамі.



Такім чынам, асноўным аргументам "супраць" "Этнафоназнаўства" было сцвярджэнне аб тым, што выпускнікі спецыялізацыі не патрэбны ў рэгіёнах. Аднак, па нашых звестках, пасля таго як "Этнафоназнаўства" выкрэслілі з плану набору, універсітэт атрымаў шмат допісаў, прычым не толькі ад абітурыентаў, якія хацелі б працягваць вывучэнне этнафоназнаўства на ўзроўні вышэйшай школы, а і з раённых упраўленняў культуры і адукацыі, якія чакаюць на працу маладых спецыялістаў.

Як запэўнілі на факультэце традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва, усе пяцёра сёлетніх выпускнікоў спецыялізацыі ўжо на гэты момант маюць запрашэнні на працу ад устаноў культуры з рэгіёнаў, дзе іх бачаць кіраўнікамі вясковых фальклорных калектываў. Так, спецыялістаў-этнафоназнаўцаў чакаюць у Вілейскім, Акцябрскім, Валожынскім, Лепельскім, Расонскім, Любанскім раёнах, дзе існуюць моцныя інстытуты падтрымкі традыцыйнай культуры.

Узнікае заканамернае пытанне: хто і як вызначае попыт на тых ці іншых спецыялістаў у рэгіёнах? Ды і ці вырашаць 5 дадатковых месцаў, аддадзеных на падрыхтоўку бібліятэкараў, кадравую праблему ў гэтай галіне?

Не пашчасціла выпускнікам 2009 года, якія планавалі паступаць на "Этнафоназнаўства". Пры паступленні на гэтую спецыяльнасць здаецца комплексны і вельмі спецыфічны экзамен. Ён уключае выкананне мясцовых твораў на народным інструменце, мясцовых песенных твораў і танца. Ёсць яшчэ і вусная частка, якая складаецца з пытанняў пра песенна-інструментальныя жанры, а таксама этнафанічнай віктарыны. Не толькі вілейскія, але акцябрскія, валожынскія, лепельскія школьнікі рыхтаваліся да творчага іспыту.

Хутчэй за ўсё, ім, прафесійна зарыентаваным абітурыентам, прыйдзецца абраць іншую спецыяльнасць. Ці пойдуць яны на бібліятэкараў?

Як запэўніў першы прарэктар БДУ культуры і мастацтваў, у 2010 годзе спецыялізацыя "Этнафоназнаўства" будзе адноўлена. Адметна, што гэта вядома ўжо зараз, хаця парадак прыёму павінен зацвярджацца ў верасні, а план набору яшчэ пазней. Відавочна, рэзананс, які атрымала прыпыненне набору на спецыялізацыю, зрабіў сваю справу. Галоўнае, каб да канца года не былі забыты аргументы тых, хто хоча вучыцца і вучыць, хто ў рэгіёнах чакае спецыялістаў па нацыянальнай культуры.

**Іна НІКІЦЕНКА.**

НА ЗДЫМКАХ: моманты студэнцкіх Каляд ва універсітэце культуры і мастацтваў.

Издательство «АВЕРСЭВ» предлагает:



**Математика. Пособие-репетитор для подготовки к централизованному тестированию**
*И. Г. Арефьева*

Покупайте в книжных магазинах республики!

В данной книге представлены тестовые задания, охватывающие все основные типы задач, которые предлагаются абитуриентам на централизованном тестировании. Материал пособия систематизирован, ко всем заданиям приводятся подробные решения, что дает возможность полноценно повторить курс математики.

Адресуется учащимся старших классов и абитуриентам для самостоятельной подготовки к централизованному тестированию, а также учителям.

Обложка твердая. 748 с.
Формат 60×84 1/16.
ISBN 978-985-509-864-6.

**По вопросам приобретения книг обращаться:** тел. (017) 334-34-84, 210-18-98
e-mail: trade@aversev.com
http://www.aversev.com
Для писем: 220123, Минск, а/я 135

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ